Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Грыцкавіцкі навучальна – педагагічны комплекс
дзіцячы сад – сярэдняя школа”

# Хлочыкі – будучыя салдаты
(канспект гутаркі у 1 рознаўзроставай групе)

Грышчанка Наталія Вікенцьеўна
вышэйшая адукацыя
1 кваліфікацыйная катэгорыя

Праграмныя задачы: фарміраваць уяўленне дзяцей пра беларускую армію, удакладніць уяўленні дзяцей аб розных відах войскаў; развіваць памяць, уяўленне; выхоўваць патрыятычныя пачуцці, пачуццё гонару за сваю армію.

Наглядны матэрыял: ілюстрацыі з рознымі відамі войскаў і ваеннай тэхнікі.

Ход гутаркі:

Выхавальнік: Хто такія абаронцы Айчыны?

Абаронцы Айчыны-гэта воіны, якія абараняюць свой народ, сваю Радзіму, Айчыну ад ворагаў. Гэта армія. У кожнага народа ёсць армія. У Беларусі таксама ёсць армія. І яна абараняе свой народ ад захопнікаў. Паглядзіце на гэтыя карцінкі

(Выхавальнік выстаўляе ілюстрацыі, якія паказваюць розныя роду войскаў).

Выхавальнік: каго вы тут бачыце?

Дзеці: Танкісты. Маракі. Артылерысты. Лётчыкі.

Выхавальнік: Вы правільна назвалі ўсіх – гэта розныя роду войскаў.

Ёсць у нас танкісты, ёсць і маракі,
Ёсць артылерысты, трапныя стралкі.
Ёсць у нас ракеты, есць і караблі.

Выхавальнік: нашы хлопчыкі хутка вырастуць і пойдуць служыць у армію. Давайце ўявім сабе, што мы апынуліся ў арміі.

Хто служыць на танку? (Танкіст.)

Хто служыць на мяжы? (Пагранічнік)

Хто лётае на верталёце? (Верталётчык.)

Хто такі ракетчык? (Хто служыць у ракетных войсках)

Як называецца чалавек, які скача з парашутам? (Парашутыст)

Як называецца салдат, у якога няма ваеннай тэхнікі? (Пехацінец)

Малайцы! А цяпер мы з вамі ператворымся ў салдат.

Фізкультмінутка “Мы - салдаты”

Мы салдаты, мы салдаты
Бадзёрым крокам мы ідзем.
У нашу армію, Рабяты,
Проста так не трапіш.
Трэба быць ўмелымі, моцнымі і смелымі.

Выхавальнік: дзеткі , а як вы думаеце, навошта трэба столькі розных войскаў?

Дзеці: каб абараняць нашу краіну.

Выхавальнік: калі ў арміі ёсць розныя віды войскаў, такая армія моцная: яна зможа абараняць сваю краіну і на сушы, і ў паветры. Але цяпер няма вайны, на нас ніхто не нападае, навошта ж тады армія ў мірны час?

Дзеці: Каб адбіць напад ворагаў.

Выхавальнік: Правільна. Армія заўсёды павінна быць гатовая да таго, каб адбіць напад ворагаў. Што ж робяць салдаты ў мірны час?

Дзеці: Салдаты займаюцца спортам, вучацца.

Выхавальнік: вучаць і трэніруюць салдат афіцэры. Каб стаць афіцэрам, трэба скончыць ваенную акадэмію.

Каб з перамагчы ворага, якімі павінны быць салдаты і афіцэры?

Дзеці: моцнымі, смелымі, хуткімі, трапнымі.

Выхавальнік: а каб такімі стаць, што трэба рабіць?

Дзеці: Трэніравацца.

Выхавальнік: Малайцы дзеткі! Скажыце пра якія войскі вы сёння даведаліся?

Дзеці пералічваюць.

Выхавальнік: а вы ведаеце, што вашы таты і дзядулі таксама былі абаронцамі Айчыны, яны служылі ў арміі. Спытайце ў іх дома ў якіх войсках яны служылі і раскажаце усім дзецям.